**НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ**

*Міхась Пазнякоў — вядомы ў нашай краіне і за яе межамі пісьменнік, перакладчык, мовазнаўца. Лаўрэат мноства літаратурных прэмій. Стварыў «Слоўнік эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы», з'яўляецца адным з аўтараў беларуска-рускага і руска-беларускага арфаграфічных слоўнікаў.*

*Ёсць у біяграфіі Міхася Пазнякова такі факт: некалькі гадоў ён працаваў у Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук БССР пад непасрэдным кіраўніцтвам класіка і выдатнага даследчыка мовы Кандрата Крапівы. Магчыма, пачуццё слова ў будучага аўтара дзясяткаў паэтычных і празаічных кніг Міхася Пазнякова шліфавалася менавіта тады. Прынамсі, у апавяданні, якое літаратар прапанаваў на конкурс «Звязды», звяртае на сябе ўвагу мова — мілагучная і выкшталцоная, якая надзвычай гарманічна перадае пачуцці героя твора, адвечны канфлікт паміж каханнем і абавязкам.*

**Алена Брава**

# Ліст з мінулага

## Міхась Пазнякоў

Адкуль, калі і як гэты ліст апынуўся ў шуфлядцы майго стала? Не, яго тут раней не было, гэта дакладна... Я ўглядваўся ў вельмі знаёмы мне прыгожы жаночы почырк... Такі не падробіш. Ліст адрасаваны менавіта мне. У канцы трэцяй старонкі ён падпісаны адной вялікай літарай «В». Крыху ніжэй было пазначана: «чэрвень 1993». Сэрца страпянулася. Я зніякавеў. Думкі міжволі сягнулі ў той далёкі час...

Дваццаць восем гадоў я не ведаў пра існаванне гэтага ліста... Хто мог хаваць і праз такі вялікі адрэзак часу падкінуць яго мне?.. Ну, вядома, толькі жонка, хто ж яшчэ? Госці? Не, гэта выключана. Мабыць, вырашыла скінуць грэх з душы, зразумеўшы, што гэты ліст ужо нічога не зменіць, не апячэ, не пакарае мяне — столькі вады ўцякло, усё змянілася ў маім жыцці...

Я адклаў канверт, разгарнуў пасланне з мінулага — тры старонкі са школьнага сшытка. У самым пачатку ўверсе выдзялялася, гіпнатызавала, хвалявала маё імя «Максіму К.»

Раптам у дзверы майго пакоя пастукалі.

— Можна адарваць цябе на хвілінку, — ціхім, выбачальным голасам запытала жонка. — Прабач, але дзве тэлеграмы прынеслі, ды і тэлефон хатні не змаўкае. Віншуюць цябе то з французскай, то з італьянскай прэміяй, то з выхадам юбілейнай кнігі...

— Прабач, — адгукнуўся я, — адключыў свой мабільны, каб не заміналі працаваць.

— Я разумею, — спакойна адрэагавала гаспадыня.

— Можа, адключы хатні тэлефон або папрацуй сакратаркай, дзякуй усім ад майго імя, кажы, што выйшаў з кватэры.

— Добра, скажы, а прэміі табе выплацілі ў еўра ці ў рублях?

— Цябе гэта вельмі турбуе? — падняў я кплівыя вочы на жонку.

— Ну, што ты, — сумелася тая, — сяброўкі мае ўсё цікавяцца. А я не ведаю, што ім казаць.

— Кажы, што ў еўра і ніяк злічыць не можаш, — усміхнуўся я.

— Зноў ты мяне не так зразумеў, — нібыта абурылася гаспадыня, не давяраючы мне, што з Парыжа і Рыма даслалі толькі дыпломы, ды і тое — па электроннай пошце.

Кабета паклала тэлеграмы на канапу і прычыніла дзверы.

Глыбокі роздум апанаваў мяне: што такое наша чалавечае жыццё? Што рухае намі? Вечныя пошукі высокага, шчырага, сапраўднага? А ці можа яно ў нашым такім недасканалым свеце быць не хвілінным, не кароткім, не выпадковым, а працяглым, нескончоным? Ці можам мы, людзі, знаходзіць сваё шчасце, зберагаць яго, быць па-сапраўднаму шчаслівымі?..

За плячыма ў мяне немалая, цікавая жыццёвая дарога, багатая на сустрэчы, здабыткі, дасягненні, узнагароды. Выраслі дзеці, падрастаюць унукі. Нібыта ўсё ёсць, ды нечага вартаснага няма... А калі і было, то мімаходзь, урыўкамі, часова...

Я падышоў да акна, і перад вачыма ўсплыў той далёкі 1993 год, успомнілася яна — аўтар незвычайнага ліста, шчырай кранальнай споведзі. Юная, прыгожая, незвычайная... Чаму так шчымліва на душы? Я зноў перачытваю ліст В. — слова ў слова:

«Чорт яго ведае, што з намі часам творыцца, сама сабе не патлумачу, сама здзіўляюся... Чаго ж мне не хапала? Бесклапотнае, забяспечанае жыццё, добры сын, клапатлівы муж — тысячы жанчын аб гэтым толькі мараць. А-а, вось чаго — галавакружэння. Надта ўжо спакойна я жыла з мужам, за яго плячыма. Побач з ім у мяне ніколі не кружылася галава, ніколі моцна не білася сэрца, не прылівала задушліва да твару кроў. Вось чаму я так і не змагла прымусіць сябе пакахаць яго, хоць — бачыць Бог! — ён заслугоўвае кахання. Не я прыдумала: чалавек не можа ўладарыць сваімі пачуццямі. Я паважала і шанавала яго як мужа, як бацьку, як добрага сябра. Аказваецца, гэтага замала, каб адчуваць сябе шчаслівай. Напэўна, мне вельмі хацелася хоць аднойчы адчуць, як ірвецца з-пад ног у чорную бездань зямля, як салодкі хмель дурманіць галаву, як за спінай вырастаюць, трымцяць — не бяда, што папяровыя, — крылы...»

Мае вочы затуманіла тонкая вільготная плёнка, сэрца забілася, бы птах у клетцы. Яна так кахала мяне!.. Я быў такі шчаслівы! I, асляплены каханнем сваім, не разумеў гэтага! Не цаніў як мае быць, не абярог нашага такога сапраўднага, святлістага кахання!.. А што я мог зрабіць у той няпросты час?! Я — жанаты, яна — замужняя! Муж — багаты прадпрымальнік! Я — бедны паэт у развальны, абыякавы да літаратуры час!.. Але, але ж як мы не зберaглі галоўнага, самага вартаснага, самага каштоўнага ў чалавечым жыцці?! Каханне, якое ўздымала нас пад аблокі, не выпускала са свайго салодкага, магутнага палону?! Не, не палон гэта быў, а штосьці незямное, незвычайна ўзаемнае, невытлумачальна прыгожае. Мы кахалі адно аднаго... Шчыра, радасна, моцна...

I мы пакутавалі нашым каханнем, не ў стане змяніць жыццёвыя абставіны... Значыць, яно не можа быць вечным, працяглым, пастаянным? I што яно такое ўвогуле? Таямніца! Неспасцігальная! Можа, і добра, што яно такое? Каханне не купіш, не атрымаеш у падарунак... Яно, непадуладнае грэшнаму чалавеку, сыходзіць з Неба і знікае па яго волі?..

Я зноў паглыбіўся ў чытанне ліста В., адрасаванага мне з далёкага 1993 года:

«Бог ёсць каханне» — дзе і ў каго я гэта вычытала? Не памятаю. Але гэта, відаць, адзіная рэлігія, адзінае бажаство, якому варта маліцца.

Ты — першы мужчына, якога я пакахала. Чаму цябе? Не ведаю. Магчыма, таму, што ўгадала ў табе адзінокую, непрыкаяную душу, якой гэтак жа пуста і халаднa жывецца на свеце, як і мне? Муж — моцны, цэльны чалавек, ён цвёрда стаіць на зямлі, яму не страшныя ніякія буры, а ты — чалавек ранімы, які балюча адчувае няўмольную імклівасць часу і неажыццявімасць жаданняў. Ты шукаў не каханку, не ўцеху на гадзіну, а жывую душу, сябра, перад якім можна паспавядацца ў цяжкі час і які зразумее цябе і моўчкі падзеліць твой боль. I я чакала такога сябра, усё жыццё чакала. Магчыма, адзінота падштурхнула нас адно да другога, была першай прыступкай нашага кахання? Пэўна, што так яно і было. Нездарма ж нашы адносіны з самага пачатку былі свабодныя ад нясцерпных пакут цела, нездарма мы не хавалі іх ад чужых вачэй — мы былі вышэйшыя за ўсякія забабоны. Нават грубым дакрананнем мы баяліся зняважыць, апошліць дзівоснае пачуццё, якое нараджалася ў нашых душах...»

I сапраўды, мы маглі гадзінамі сядзець насупраць, вочы ў вочы, і размаўляць, дзяліцца ўражаннямі, радавацца прачытанаму ці ўбачанаму. Мы былі невымоўна шчаслівыя бачыць адно другога, дыхаць адным паветрам, свяціцца ўзаемнай радасцю, не дакранаючыся нават да рук. У нас былі агульныя погляды на жыццё, на свет, на дабро і зло. Нас яднала ўсё: ад зямлі да неба. Як звонка, сонечна, радасна смяялася яна, калі я жартаваў, чытаў паэтычныя экспромты, заўважаў у самым простым незвычайнае. Памятаю, ранняй бясснежнай зімой прагульваліся вечарам па праспекце Пераможцаў. Тратуар ажно зырчэў і звінеў ад снежнай крупкі. Я пажартаваў: колькі брыльянтаў высыпала неба нам пад ногі, але мы не будзем збіраць іх. Яна доўга, цёпла, залівіста смяялася, нібы я выдаў такі перл, якога ўвесь свет яшчэ не чуў. Гэта радавалася яе адчуванне і разуменне мяне, маёй чалавечай сутнасці, якая так імпанавала ёй, у якой яна пачувала сябе шчаслівай і вольнай.

А калі я трапіў у бальніцу і пасля аперацыі ляжаў некалькі дзён з забінтаванымі вачыма, яна прыходзіла і карміла мяне з лыжачкі. Ад яе кранальнай пяшчоты я плакаў, радуючыся, што за бінтамі В. не бачыць маіх па-дзіцячаму шчаслівых слёз. Мужчыны ў палаце зайздросцілі мне і ўздыхалі, заўважаючы: «Які шчаслівчык!..»

Аднаго разу, калі мы позна заседзеліся ў яе дома і нечакана прыехаў з камандзіроўкі муж, яна ніколькі не разгубілася. Пазнаёміла нас, не адправіла мяне сярод ночы дамоў. I мы з ім пазней віталіся пры сустрэчах, нават часам ён адвозіў мяне на сваёй машыне дахаты...

Неўзабаве яны паехалі ў працяглую замежную камандзіроўку...

Некалькі разоў яна патэлефанавала мне з-за мяжы. Аднаго разу, прыехаўшы ў Мінск да маці, папрасіла аб сустрэчы. Мы больш за гадзіну гулялі па горадзе, часам дакараючы адно другога за страчанае. Яшчэ некалькі разоў яна набірала мой нумар тэлефона, маўчала і клала слухаўку. Я адчуваў яе дыханне і разумеў, што ў яе на душы. Яна баялася вяртання да страчанага намі...

Мне раптам стала вельмі балюча і горка... Калі ў той даўні час я зразумеў, што пакахаў яе ўсім сэрцам, то прызнаўся жонцы і пайшоў з дому. Я быў сумленны перад імі. Зняў кватэру. О, якія шчаслівыя мы былі ў тыя дні і ночы, калі яна магла быць са мной! Калі мы цалкам належалі адно аднаму. Тады ўвесь свет нібы знікаў або станавіўся намі. Але аднаго разу, калі яна не намервалася завітаць на нашу кватэру, я загасцяваў у роднай сястры, дзе і заначаваў. А яна, засамоціўшыся, вырашыла позна ўвечары абрадаваць мяне сваім неспадзяваным з'яўленнем. Яна чакала мяне, запаліўшы свечку і выглядваючы ў акно, ды так і не дачакалася. О, як жа балюча ёй было ў тую ноч!.. Як вусцішна і самотна. Мяне і цяпер працінае наскрозь той яе цягучы боль. Пра што яна думала? Якія маланкі пачуццяў абпальвалі яе ўражлівую душу! Мабільных тэлефонаў тады яшчэ не было, і яна не ведала, дзе я і што са мною. Даруй мне, В., бадай, гэтую адзіную, але жахлівую недарэчнасць у нашых адносінах...

На вуліцы за акном раптам зашумеў парывісты вецер, а затым шугануў вялікі, заліўны дождж. Памятаю, і нас з ёю аднойчы за горадам застаў такі ж напорысты, шчыльны дождж. Схавацца на адкрытым месцы немагчыма. А нам было прыемна і радасна! Мы смяяліся, шчаслівыя і ўзнёслыя, нібы дождж змываў назаўсёды ўсе нашы сумоты і перашкоды. Танчылі, лавілі струмені ў прыгаршчы і дарылі адно другому. Нашы вочы і сэрцы былі перапоўнены сонцам кахання, сілай даверу, музыкай еднасці, песняю шчасця!..

Я зноў скіраваў свой позірк да ліста ад В., шкадуючы, што ён такі кароткі. Яна ж закончыла яго такімі словамі:

«Твая душа — гэта жывая крыніца, чыстая, светлая, якая прабіваецца на свет праз вечныя пласты зямлі. Вось чаму ў мяне так закружылася галава...»

— Табе зноў тэлефануюць, каб павіншаваць, — зноў пастукала ў мой пакой жонка.

— Скажы, калі ласка, што я выйшаў. Дзякуй усім ад майго імя.

Я хутка апрануўся і выйшаў з кватэры.

— Ты куды? Дождж на вуліцы, — занепакоілася жонка. — Хоць парасон вазьмі!

— Не трэба, — мякка адказаў я. — Хіба можа штосьці быць лепшым за дождж? Хачу паслухаць яго на вуліцы. — I націснуў кнопку ліфта.

Я паспяшаўся ў метро, не задумваючыся, куды паеду і чаму. Па дарозе прыгадаў, што, гуляючы ў той даўні час каля Свіслачы, мы з В. выбралі памятнае дрэва побач з мостам — магутную таполю. I далі слова: калі нешта разлучыць нас, то будзем прыходзіць да яго. Я выйшаў на станцыі «Кастрычніцкая» і пакрочыў да ракі. Дождж не сунімаўся, але ён быў цёплы і не надта густы. Я крочыў без парасона, ловячы светлыя казытлівыя струмені ў далоні і абмываючы імі гарачы твар. Напэўна, я здзіўляў рэдкіх прахожых, але не звяртаў на іх ніякай увагі. I кіраваў да таполі, да сапраўднага, але мімалётнага і незваротнага шчасця.

Спорт-тайм

# Бокс тайскі — медалі беларускія

**У традыцыйным аглядзе расказваем цікавыя спартыўныя навіны**

**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Беларускія спартсмены выступілі на чэмпіянаце свету па тайскім боксе. Дадому яны прывезлі сем медалёў. Чэмпіёнам свету ў катэгорыі U23 стаў Яўген Федарынчык, які спаборнічае ў катэгорыі да 71 кг. Сярэбраныя медалі заваявалі Іван Шангін, які выступае ў катэгорыі да 60 кг сярод моладзі, Мікіта Кокаш (U23 86 кг). Бронзавымі прызёрам сталі Валянцін Капытаў (да 91 кг), Даніїл Дзедавец (да 63,5 кг), Арцём Варывацкі (U23, да 57 кг) і Паліна Ламінская (U23, да 71 кг).



**АБ'ЯВА ТЫДНЯ.** Стаў вядомы расклад трох першых матчаў мінскага «Дынама» ў сезоне-2024/25 Кантынентальнай хакейнай лігі, паведамілі ў прэс-службе сталічнага клуба. Першым сапернікам падапечных Дзмітрыя Квартальнава ў новым сезоне будзе хабараўскі «Амур». Сустрэча пройдзе ў «Мінск-Арэне» ў чацвер, 5 верасня. У мінулым розыгрышы КХЛ абедзве каманды занялі восьмыя месцы ў сваіх канферэнцыях і завяршылі барацьбу за Кубак Гагарына ў першым раўндзе плэй-оф. Абедзве вочныя сустрэчы засталіся за хабараўчанамі. Пасля хатняга паядынку «зуброў» чакаюць два выязныя матчы — з маскоўскім «Спартаком» 9 верасня і супраць падмаскоўнага «Віцязя» 11 верасня. Новы сезон Кантынентальнай хакейнай лігі стартуе ў Магнітагорску 3 верасня з гульні за Кубак Адкрыцця паміж дзейным чэмпіёнам «Металургам» і яраслаўскім «Лакаматывам».

**ТУРНІР ТЫДНЯ.** У Алімпійскім комплексе «Лужнікі» ў Маскве ў рамках «Тыдня лёгкай атлетыкі» прайшлі Усерасійскія спаборніцтвы «Мемарыял братоў Знаменскіх». У турніры выступілі 15 беларускіх лёгкаатлетаў, васьмёра сталі медалістамі. Пераможцамі мемарыялу Знаменскіх у штурханні ядра сталі Алена Дубіцкая (18,13 м) і Алег Тамашэвіч (21,08 м), у сектары для трайнога скачка роўных не было Віялеце Скварцовай (14,39 м), а ў жаночым бар'ерным бегу на 100 м найлепшы вынік паказала Эльвіра Грабарэнка (12,86 сек). Услед за сяброўкай па камандзе фінішавала Святлана Парахонька. Трэцяе месца ў сваіх дысцыплінах занялі Карына Дзямідзік (скачкі ў вышыню), Яніна Луцэнка (100 м) і Віталь Парахонька (110 м з бар'ерамі). Завяршальным стартам «Тыдня лёгкай атлетыкі» ў Маскве стаў «Дзень скачкоў». Другое месца ў сектары для скачкоў з шастом заняў Мацвей Воўкаў, Карына Дзямідзік у спаборніцтвах па скачках у вышыню стала трэцяй.

**ПАРАЖЭННЕ ТЫДНЯ.** Арына Сабаленка не здолела прабіцца ў паўфінал Адкрытага чэмпіянату Францыі. У апошнім чвэрцьфінальным паядынку яна саступіла 17-гадовай расіянцы Міры Андрэевай, якая займае 38-е месца ў рэйтынгу WTA, — 7:6 (7:5), 4:6, 4:6. Па выніках Адкрытага чэмпіянату Францыі Арына Сабаленка страціла другую пазіцыю ў рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі. Цяпер яна займае трэці радок.

**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** Сем медалёў заваявалі беларускія спартсмены падчас другога этапу міжнароднай серыі Гран-пры па веласпорце на трэку, які прайшоў у Санкт-Пецярбургу. Карына Бірук перамагла ў омніуме і заняла другое месца ў гонцы праследавання, дзе найлепшы вынік паказала Анастасія Кіпцікава. Яшчэ адна беларуска Аліна Кароткіна стала ў омніуме трэцяй. У мужчынскім кейрыне сярэбраны медаль заваяваў Арцём Зайцаў. Гэта ўзнагарода стала для беларускага веласіпедыста трэцяй на турніры. Раней Зайцаў перамог у індывідуальным спрынце, а таксама разам з прадстаўнікамі Тульскай вобласці першынстваваў у камандным спрынце.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** Беларускія барцы вольнага стылю выступілі на рэйтынгавым турніры «Мемарыял Імрэ Паяка і Янаша Варгі» ў Будапешце. Беларускую мужчынскую каманду па вольнай барацьбе на спаборніцтвах прадставілі Арыян Цютрын, Аляксандр Гуштын і Дзяніс Храмянкоў. Медалістам турніру стаў толькі Арыян Цютрын, які заваяваў бронзавы медаль у катэгорыі да 57 кг.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

11 ЧЭРВЕНЯ | Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1923** год — у БССР да трэцяй гадавіны вызвалення ад польскай акупацыі абвяшчаецца амністыя тым дзеячам беларускага руху, якія не змагаліся з савецкай уладай са зброяй у руках.

**1924** год — нарадзіўся Барыс Міхайлавіч Дзмітрыеў, удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. З чэрвеня 1942 года ў 211-м партызанскім атрадзе імя К. К. Ракасоўскага, які дзейнічаў на тэрыторыі Асіповіцкага раёна. Удзельнічаў у падрыве 18 варожых эшалонаў, у выніку чаго знішчана 32 аўтамашыны, 8 танкаў, 11 гармат, 154 тоны паліва, 1260 гітлераўцаў. Дыверсійныя групы на чале з Дзмітрыевым падарвалі 1400 чыгуначных рэек, 11 чыгуначных і 32 шашэйныя масты, 22 аўтамашыны, 3 танкі праціўніка. Загінуў у 1944 годзе ў баі каля в. Камянічы Асіповіцкага раёна.

**1934** год — нарадзіўся (в. Бярозаўка Слуцкага раёна) Анатоль Паўлавіч Хількевіч беларускі вучоны, доктар філасофскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Працаваў у Нацыянальным інстытуце бяспекі, у Мінскім інстытуце кіравання. Аўтар навуковых прац па тэорыі і метадалогіі пазнання, праблемах логікі, псіхалогіі асобы, юрыдычнай псіхалогіі.



**1942** год — нарадзіўся (г. Буда-Кашалёва) Яраслаў Пятроў, савецкі і беларускі оперны і камерны спявак (бас), саліст Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, народны артыст Беларускай ССР. У маладосці служыў у Ваенна-марскім флоце СССР мараком-падводнікам, вадалазам. Пасля арміі працаваў у родным Буда-Кашалёве мулярам і слесарам-наладчыкам.

У свеце

**1496** год — Хрыстафор Калумб завяршыў сваё другое падарожжа, пасля чаго трапіў у няласку іспанскай каралевы з-за таго, што так і не знайшоў марскі шлях у Кітай.



**1770** год — брытанскі першаадкрывальнік і навігатар Джэймс Кук (на выяве) адкрыў Вялікі бар'ерны рыф каля ўзбярэжжа Аўстраліі (найвялікшы ў свеце каралавы рыф, які відаць з космасу).

**1811** год — нарадзіўся Вісарыён Бялінскі, рускі літаратурны крытык, публіцыст, філосаф і дэмакрат.

**1910** год — нарадзіўся Жак-Іў Кусто, французскі акіянограф, вучоны, фатограф, вынаходнік акваланга. З 1952 года кіраваў падводнымі даследаваннямі на судне «Каліпса», з 1985 года — на турбапарусным судне «Алкіёна». З 1957-га — дырэктар Акіянаграфічнага музея ў Манака. Займаўся пытаннямі аховы падводнага асяроддзя. Аўтар кніг і каля 90 дакументальных фільмаў, сярод якіх «Свет маўчання», «Залатая рыба» (прэмія «Оскар», 1960) і «Свет без сонца» (прэмія «Оскар», 1965).

Так гаварыў...

**СТЭНДАЛЬ:**

*«Чалавек жыве на зямлі не для таго, каб стаць багатым, а для таго, каб стаць шчаслівым».*

Надвор'е

# Моцныя дажджы і навальніцы «патушаць» спякоту, але ненадоўга

**Пачатак гэтага тыдня абяцае быць дажджлівым. Пры развіцці воблачнасці і залішняй вільготнасці ноччу месцамі ў паўночных і цэнтральных раёнах, а днём у асобных раёнах па паўднёвым усходзе дажджы будуць дасягаць крытэрыяў моцных. Пры навальніцах месцамі будзе ўзмацняцца вецер да моцнага парывістага, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У аўторак нашу краіну чакае «супердождж». У гэтыя суткі, ноччу на большай частцы тэрыторыі, а днём пераважна па ўсходняй палове краіны пройдуць дажджы, месцамі моцныя. Ноччу ў многіх раёнах, а днём па ўсходняй палове прагрымяць навальніцы, пры навальніцах месцамі ўзмацненне ветру парывамі 15—20 м/с. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах згусціцца туман. Тэмпература паветра ўдзень складзе ад 21 да 27 градусаў.

У ноч на сераду ў нашай краіне захаваецца ўплыў няўстойлівых паветраных мас. Таму кароткачасовыя дажджы пройдуць месцамі па тэрыторыі краіны. Днём фон атмасфернага ціску будзе расці, і ў большасці раёнаў істотных ападкаў не чакаецца, толькі па паўднёвым усходзе, дзе будзе адбівацца ўплыў малаактыўнага атмасфернага фронту, месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. У цёмны час сутак пахаладае значна. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 7 да плюс 14 градусаў, а па паўднёвым усходзе — да 17 градусаў. Днём тэмпература павысіцца да 19—24 цяпла.

Згодна з папярэднім прагнозам айчынных сіноптыкаў, у далейшым пры павышаным фоне атмасфернага ціску ападкаў па краіне чакаецца няшмат, яны будуць адзначацца лакальна і насіць кароткачасовы характар. Месцамі дажджы будуць суправаджацца навальніцамі. У чацвер пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі слабы туман. Уначы слупкі тэрмометраў пакажуць 7—13 градусаў, удзень — 17—24 цяпла.

У пятніцу месцамі па краіне, днём і ноччу прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, а часам навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 7 да 14 градусаў, а ўдзень — ад 18 да 25 градусаў. I ў суботу месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы дасягне 7—14 градусаў, а ўдзень стане цяплей — да 19—25 цяпла. Адносна дажджлівай чакаецца і нядзеля, калі атмасферны фон пачне павольна падымацца. У гэты дзень месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах слабы туман. Уначы сіноптыкі абяцаюць ужо ад 8 да 14 градусаў, а ўдзень — ад 19 градусаў на поўначы, да 27 цяпла на поўдні краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.38 | 21.41 | 17.03 |
| Віцебск — | 4.19 | 21.39 | 17.20 |
| Магілёў — | 4.28 | 21.31 | 17.03 |
| Гомель — | 4.34 | 21.18 | 16.44 |
| Гродна — | 4.55 | 21.55 | 17.00 |
| Брэст — | 5.05 | 21.46 | 16.41 |

**Месяц**

***Маладзік 6 чэрвеня.***

***Месяц у сузор'і Льва.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Фядоссі, Івана, Лукі.*
***К.*** *Вдэлаіды, Настассі, Розы, Варнавы, Фелікса.*



Фота Аляксандра АСІПЕНКІ.

## ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**Хацеў піўка купіць, а ў горадзе выпускны — не прадаюць. У выніку я цвярозы, а школьнікі п'яныя.**

— Ты такая бледная... Цябе трэба паказаць доктару!
— Не, мяне трэба паказаць мору!

**Сёння прыбраўся ў кватэры. Аказалася, той маленькі пуфік, што стаяў каля ложка і куды я ставіў ноўт, — гэта паўмяшка цэменту.**

— Дарагі, я не чакала, што наш сын так высока ўзляціць!
— Так, катапульта проста ўзрушальная, нясі дачку...



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 10.644. Індэкс 63850. Зак. № 1357.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 10 чэрвеня 2024 года.